*М. Р. Прыгодзіч (Мінск)*

# І. І. НАСОВІЧ ЯК БЕЛАРУСКІ ЛЕКСІКОГРАФ XIX СТАГОДДЗЯ

У сузор'і імёнаў слаўнавядомых дзеячаў беларускай культуры і навукі адметнае месца належыць Івану Іванавічу Насовічу, выдатнаму моваведу, этнографу і фалькларысту, які ўсё сваё жыццё прысвяціў вывучэнню багацейшай духоўнай спадчыны беларускага народа. «Беларускім Далем» называлі яго сучаснікі, «навуковым подзвігам» характарызавалі жыццё гэтага простага настаўніка ўдзячныя нашчадкі.

І. І. Насовіч нарадзіўся 26 верасня (7 кастрычніка па н. ст.) 1788 г. ў в. Гразівец былога Быхаўскага павета Магілёўскай губерні ў сям'і свяшчэнніка. Пасля заканчэння ў 1812 г. Магілёўскай духоўнай семінарыі працаваў выкладчыкам, а пасля – інспектарам Аршанскага, выкладчыкам і рэктарам Мсціслаўскага духоўных вучылішчаў, загадчыкам Дынабургскай гімназіі, Маладзечанскага і Свянцянскага дваранскіх вучылішчаў. У 1844 годзе Насовіч атрымаў адстаўку і пераехаў на пастаяннае жыхарства ў Мсціслаў. 56-гадовы настаўнік заняўся навуковай сістэматызацыяй матэрыялаў па беларускай мове і фальклору, зборам якіх займаўся ўсё сваё жыццё. Сын вучонага, Васіль Іванавіч, успамінаў: «Для паспяховага выканання гэтай справы бацька мой не шкадаваў ніякіх сродкаў, ні з чым не лічыўся, ездзіў у розныя мясцовасці. Жывучы з маленства сярод сельскага люду, добра ведаў як гаворку беларусаў, так і мноства іх песень, прыказак, прымавак. Памятаю яшчэ, што ён, як толькі пачаў збіраць матэрыялы для слоўніка, заўсёды насіў пры сабе сшытак, куды тут жа занатоўваў кожнае новае для яго слова, якое траплялася яму ў гутарцы з простым чалавекам, кожную цікавую песню, прыказку. Людзі, больш або менш адукаваныя ставіліся з павагай да этнаграфічнай працы майго бацькі, усяляк садзейнічалі яму ў гэтым… ».

Цікавасць Насовіча да вывучэння беларускай народнай творчасці была звязана з актывізацыяй рэвалюцыйна-вызваленчага руху, калі на Беларусі пачалі пашырацца ідэі нацыянальнай самасвядомасці. Нягледзячы на адсутнасць друкаваных органаў на беларускай мове, на царскую палітыку русіфікацыі заходніх ускраін імперыі, на выкараненне ўсяго мясцовага, цікавасць да беларускага краю не змяншалася. На старонках рускага і польскага перыядычнага друку ў сярэдзіне і другой палавіне XIX ст. друкуюцца розныя творы народна-фальклорнага зместу, матэрыялы па этнаграфіі і гісторыі Беларусі. З сярэдзіны XIX ст. вывучэнне народнай гаворкі, помнікаў пісьменства, фальклору і этнаграфіі ў Беларусі стала праводзіцца пад кіраўніцтвам і па даручэнню рускага геаграфічнага таварыства. Разасланая ў 1847 годзе праграма этнаграфічнага аддзела таварыства аб'ядноўвала ўласна этнаграфію, антрапалогію, фалькларыстыку і мовазнаўства. Самым актыўным карэспандэнтам геаграфічнага таварыства стаў І. І. Насовіч.



Ужо ў 1850 годзе І. Насовіч дасылае ў Аддзяленне рускай мовы і славеснасці Акадэміі навук тры рукапісы: філалагічныя назіранні над беларускай гаворкай, невялікі беларускі слоўнік і зборнік беларускіх прыказак. У хуткім часе у «Известиях Академии наук» (1852) з'яўляецца водгук акадэміка І. І. Сразнеўскага: «Працы І. Насовіча заслугоўваюць пільнай увагі, а ўменне п. Насовіча ўзяцца за справу, уменне, якое падмацоўваецца тут магчымасцю рабіць і правяраць назіранні на месцы, яшчэ больш выклікае да яго павагу… Зборнік прыказак выдатны не толькі па велічыні, але і па ўнутранай каштоўнасці». У гэтым жа нумары ў раздзеле «Помнікі і ўзоры народнай мовы і славеснасці» друкуюцца прыказкі, а ў раздзеле «Матэрыялы да слоўніка» змешчаны артыкул І. І. Насовіча «Тлумачэнні да беларускіх прыказак і прымавак».

Першыя публікацыі акрылілі даследчыка, і ён поўнасцю аддаецца любімай рабоце. У хуткім часе перасылае акадэміку І. І. Сразнеўскаму новыя працы. Па прапанове Аддзялення рускай мовы і славеснасці І. Насовіч бярэцца за складанне алфавітнага паказальніка старажытных беларускіх слоў, якія ўжываюцца ў Актах Заходняй Расіі. Так з'явіўся рукапіс першага гістарычнага слоўніка беларускай мовы, над якім даследчык працаваў больш як пяць гадоў. У гэты ж час ён працягвае збіраць фальклорныя матэрыялы, працуе над беларускім тлумачальным слоўнікам.

У 60-я гады работы І. І. Насовіча набываюць усеагульнае прызнанне. Былы настаўнік, філолаг-аматар у 1865 годзе становіцца лаўрэатам дзвюх прэстыжных прэмій Акадэміі навук: «Алфавітнаму паказальніку старажытных беларускіх слоў, выбраных з Актаў, што адносяцца да гісторыі Заходняй Расіі», прысуджаецца Увараўская прэмія, а за рукапіс «Слоўніка беларускай гаворкі» вучоны атрымлівае палавінную Дзямідаўскую прэмію. Заслугі беларускага даследчыка ацанілі і ў Рускім геаграфічным таварыстве, якое ў гэты ж час выбірае І. І. Насовіча сваім членам, а праз два гады (1867) за збор беларускіх прыказак прысуджае яму залаты медаль.

Зборнік І. Насовіча «Беларускія прыказкі» заняў асобнае месца не толькі ў гісторыі беларускай фалькларыстыкі другой палавіны XIX ст., але і ў фалькларыстыцы ўсходніх славян. Складальнік не задаволіўся звычайнай публікацыяй фальклорных твораў, ён паспрабаваў раскрыць іх сэнс, выявіць паходжанне трапных народных выслоўяў, параўнаць іх з адпаведнымі ў рускай, а таксама польскай, французскай і лацінскай мовах. Падобнага даследавання не мае нават сучасная ўсходнеславянская фалькларыстыка. Тым больш прыемна, што наш суайчыннік змог гэта зрабіць яшчэ ў другой палавіне XIX ст.

Вяршыняй збіральніцкай і навуковай дзейнасці І. Насовіча стаў «Слоўнік беларускай гаворкі», у якім сабрана і растлумачана больш як 30 тысяч слоў жывой беларускай мовы. Гэты тлумачальны слоўнік беларускай мовы XIX ст. быў першым грунтоўным даследаваннем у галіне беларускай лексікаграфіі, у якім адлюстравана багацце лексічнага корпуса гутарковага беларускага слова. Укладанню слоўніка І. Насовіч аддаў каля 20 гадоў сваго жыцця. У 1868 годзе «Слоўнік

беларускай гаворкі» быў канчаткова падрыхтаваны да друку. Выхад яго ў свет у 1870 годзе стаў знамянальнай падзеяй у культурным жыцці беларускага народа, з'явай выключнай важнасці, якая заклала асновы да сапраўды глыбокага і ўсебаковага вывучэння беларускай мовы. Гэтае лексікаграфічнае даследаванне не страціла сваёй навуковай і практычнай вартасці і па сённяшні дзень.

Матэрыялам для ўкладання слоўніка І. Насовічу служылі яго ўласныя запісы, якія ён рабіў у час паездак па Магілёўскай, Мінскай і Гродзенскай губернях, яго фальклорныя і этнаграфічныя зборнікі, алфавітны паказальнік старажытных беларускіх слоў, выбраных з помнікаў старабеларускага пісьменства, шматлікія філалагічныя зборнікі і асобныя публікацыі таго часу.

Будучы з'явай арыгінальнай і непаўторнай, «Слоўнік беларускай гаворкі» І. Насовіча засведчыў стан і ўзровень навуковага развіцця беларускай мовы XIX ст., данёс і перадаў нам яе лексічнае і фразеалагічнае багацце, адлюстраваў у жывым слове «глыбіню мыслення і светаразуменне беларусаў як нацыі». Праца І. І. Насовіча здзівіла тагачасную навуковую грамадскасць маштабнасцю і глыбінёй даследавання лексічнага матэрыялу. І. І. Сразнеўскі падкрэсліваў, што ў гэтым слоўніку дадзена месца ўсякаму слову, якое пачынаецца ў беларускай мове. Побач з агульнаўжывальнай лексікай у ім прыводзяцца і тыя словы, якія вядомы толькі ў асобных мясцовых гаворках або абмежаваныя сферай іх ужывання. Укладальнік свядома не ўключаў у слоўнік слоў, агульных для беларускай і рускай моў, якія поўнасцю супадаюць у лексічным значэнні. Каштоўным у слоўніку з'яўляецца і надзвычай багаты лексічны матэрыял, які побач з фанетычнымі і граматычнымі асаблівасцямі надаваў беларускай мове самабытны, арыгінальны нацыянальны каларыт.

У «Слоўніку беларускай гаворкі» І. Насовіча словы размяшчаюцца ў строгім алфавітным парадку, словаўтваральна-гнездавым спосабам. Параўн.:

**ВЫЛУПА́ЦЬ,** *сов. Вы́лупиць, гл. д. 1) Выпучивать. Што ты вочи вылупаешь, вылупивъ на мене? 2) Выставлять наружу. Вылупаць, вылупиць зубы. Матка вылупила свою до́чку на показъ.*

**ВЫЛУПА́ЦЬЦА,** *сов. Вылупицьца, гл. возвр. 1) Выказываться изъ чего. Орехи не вылупаюцца, не вылупились еще. Пискляты зачали вылупацьца. 2) Выставлять себя на показъ. Вылупаецца, вылупилась, якъ бы што доброе.*

**ВЫ́ЛУПИЦЬ,** *1) см. Вылупаць. 2) сов. глагола д. Лупи́ць – бить. Ударить. Якъ вылуплю цебе бизунумъ, дакъ и замовчишъ.*

**ВЫ́ЛУПИЦЬЦА,** *1) см. Вылупа́цьца. 2) Удариться. Вылупився лбомъ объ притолку. Посковзнувшись вылупився задницею.*

**ВЫЛУ́ПЛИВАЦЬ,** *гл. д. 1) Очищать отъ шелухи или кожуры. Вылу́пливаць орехи, бобъ. 2) Тоже, что вылупа́ць.*

**ВЫЛУ́ПЛИВАЦЬЦА**, *гл. возвр. 1) Очищаться отъ кожицы или шелухи. Орехи молоды, еще не вылупливаюцца. 2) Тоже, что Вылупацьца во 2-мъ знач.*

**ВЫЛУПЛЯ́ЦЬ**, *гл. д. Тоже, что Вылупаць и Вылупливаць.*



**ВЫЛУПЛЯ́ЦЬЦА,** *гл. возвр. Тоже, что Вылупацьца и Вылупливацьца.*

**ВЫ́ЛУПОКЪ,** *пка, с. м. 1) Мальчикъ съ быстрыми, а более выпученными глазами. Вылупокъ гетый усюдыхъ подглядзиць. 2) Мальчикъ съ выставленнымъ наружу брюхомъ. Вылупки твое бегаюць по вулице. 3) Цыпленокъ, только что вышедшій изъ яйца.*

Такі метад даў магчымасць даследчыку адразу вызначыць усе лінгвістычныя ўзроўні слова, яго генетычныя, семантычныя і стылістычныя магчымасці, паказаць шляхі папаўнення і ўзбагачэння слоўнікавага корпуса мовы. Каштоўным у працы з'яўляецца не толькі расшыфроўка значэнняў мнагазначных слоў, але і апісанне іх сэнсавай структуры. Доўгія гады творчых пошукаў дапамаглі даследчыку выбраць з велізарнага ілюстрацыйнага матэрыялу такія прыклады-цытаты, якія найбольш поўна і дакладна раскрываюць сэнс таго або іншага слова. Параўн.:

**ЗЯЗЮ́ЛЬКА,** *-ки, и умен.* **ЗЯЗЮ́ЛЯ,** *и, с. ж. 1) Кукушка. Зязюлка кукуець. Зязюля, зазюля, скажи, скольки мне летъ жиць? Погов. Говорять, слыша голось кукушки въ лесу.*

*Куковала зязюлка въ садочку,*

*Приложивши головку къ листочку. Изъ свад. песни.*

*2) перен. Любимая женщина. Ночная зязюлька дзенную перекукуець. Посл. Говорится о жене, которая въ ночномъ разговоре съ мужумъ, изменяеть его намеренія и мысли.*

*3) Самый голосъ кукушки. Сховай дзенужку на зязюльку. Поверье: если, первый разъ весною слыша голосъ кукушки, имеешь въ кармане деньги, то въ продолженіе целаго года будешь иметь ихъ.*

Выхаваны на традыцыях айчыннай лексікаграфічнай навукі, І. Насовіч падае словы ў адпаведнасці з прынцыпамі тагачаснага рускага правапісу. Аднак глыбокае веданне жывой беларускай мовы схіляла яго ўсякі раз рабіць адступленні ад традыцыйных прыёмаў пісьма. Таму ў слоўніку знайшлі адлюстраванне некаторыя важнейшыя фанетычныя асаблівасці беларускай мовы – дзеканне, цеканне, падаўжэнне зычных і інш., якія ўпершыню былі зафіксаваны І. Насовічам у беларускім мовазнаўстве і ў далейшым сталі нормай літаратурнай мовы. Параўн.:

**ЗЯ́ЦЬ**, *я, множ. Зяци́, -цей, -ця́мъ, с. м. Зять. Зяць любиць взяць. Посл. Въ зяци пошовъ, приставъ.*

**ИЛГА́ЦЬ,** *илгу, жешь, сов. Съилга́ць. Лгать, врать. Гладко илжешь, съилгавъ. Слич. Вра́ць.*

**КА́ХЛЯ,** *и, с. ж. Изразецъ. Зеленыя кахли на печце у пана.*

**КАЦИ́ЦЬЦА,** *-цуся, коцишся, сов. Закацицьца, Скоци́цьца, гл. возвр. 1) Катиться. Грошы котки, скоро зъ рукъ коцюцца. Гривенникъ скоціўся подъ столъ, колибъ не закацився въ дзирку. Лежи смирно, а то зъ лавки скоцишся. 2) сов. Покацицьца. Стремительно течь. Слёзы коцюцца, покацилися зъ вочей.*

*Я на ганочкахъ стою, слёзы коцюцца;*
*Дзевки замужъ идуць, и мне хочецца.*

**МЯ́ККІЙ,** *сравн. Мякшій, прил. Мягкій. Мяккій хлебъ не споренъ. Мякшаго хлеба дай.*

«Слоўнік беларускай гаворкі» І. Насовіча – з'ява выключная не толькі ў беларускім, але ўвогуле ў славянскім мовазнаўстве. На ўсіх этапах развіцця беларускай лексікаграфіі ён служыў і служыць выдатным узорам, на які арыентаваліся многія ўкладальнікі перакладных двухмоўных і дыялектных слоўнікаў. За амаль 140 гадоў, што прайшлі пасля выхаду слоўніка І. Насовіча, адбыліся карэнныя змены ў жыцці нашага грамадства. Сённяшняя Беларусь будуе новую дзяржаву з сацыяльна-арыентаванай эканомікай, накіраванай на ўсебаковае развіццё грамадства, навукі і культуры. Гэта выклікала і выклікае да жыцця новыя лексічныя мікрасістэмы, тэматычныя групы слоў. Багаты лексічны корпус сучаснай беларускай літаратурнай мовы асабліва наглядна выяўляецца ў супастаўленні са «Слоўнікам беларускай гаворкі» І. Насовіча, у якім, як у люстэрку, праз лексіку адбілася сацыяльна-эканамічнае, грамадска-палітычнае і культурнае жыццё тагачаснага грамадства. Слоўнік І. Насовіча дае магчымасць прасачыць эвалюцыю лексічных значэнняў слоў, адміранне адных слоў і з'яўленне новых, якія адлюстравалі паняцці новага часу.

Перагортваеш старонкі шматлікіх работ І. Насовіча, якія выходзілі амаль кожны год да самай смерці вучонага ў 1877 г., і не перастаеш здзіўляцца таму, як многа змог зрабіць гэты чалавек. Ацэньваючы зробленае беларускім вучоным, акадэмік Ізмаіл Сразнеўскі пісаў: «Сярод працаўнікоў навукі ёсць заўсёды асобы, вядомыя і паважаныя значна меней, чым таго яны заслужылі. Да ліку такіх працаўнікоў навукі належыць і п. Насовіч. Нікім не падтрыманы, ён працаваў ужо доўгія гады над вывучэннем быту і мовы беларускага народа; з незвычайнай стараннасцю сабраў і прывёў да ладу велізарны матэрыял. У руках маіх перабывалі яго аб'ёмістыя зборнікі беларускіх прыказак, прымавак, загадак, казак і іншых помнікаў мовы; наўрад ці можна назваць што-небудзь лепшае ў гэтым родзе па шырыні і сур'ёзнасці зместу… . Я лічу, што неабходна было б выдаць сабранае ім усё без выключэння, таму што ўсё аднолькава заслугоўвае поўнага даверу і ўсё цікавае і патрэбнае для пазнання беларускага народа».

Пераважная большасць работ І. Насовіча ў наш час не перавыдавалася. Толькі ў 1983 годзе, дзякуючы намаганням супрацоўнікаў акадэмічнага Інстытута мовазнаўства імя Якуба Коласа, а таксама даўняму даследчыку лексікаграфічнай спадчыны беларускага вучонага М. Судніку, выйшла факсімільнае выданне «Слоўніка беларускай гаворкі» (у арыгінале «Словарь белорусского наречия»). Аб'ёмныя «Успаміны майго жыцця» І. Насовіча з грунтоўнай прадмовай Ніла Гілевіча ў 1997 годзе апублікаваў часопіс «Нёман» (№ 2 – 4). Успаміны вучонага цікавыя не толькі для разумення тых ці іншых этапаў жыццёвага шляху І. Насовіча. У ім



чытач знойдзе погляды былога настаўніка на сістэму народнай адукацыі, грамадска-палітычны лад у беларускім краі, асобныя развагі пра стан беларускага пісьменства і яго лёс у гісторыі і інш. Многія выданні І. Насовіча па-ранейшаму застаюцца маладаступнымі для шырокага чытача, асобныя з іх зберагаюцца ў рукапісным выглядзе і чакаюць свайго даследчыка і выдаўца.

Аддзел рэдкай кнігі Фундаментальнай бібліятэкі БДУ валодае унікальным экземплярам «Слоўніка беларускай гаворкі» І. Насовіча, які цэлыя восем гадоў рыхтаваўся да друку. Некалькі разоў мяняліся навуковыя рэдактары, па-рознаму глядзелі яны і на сам факт выдання гэтай капітальнай працы, роўнай хіба што славутаму слоўніку Уладзіміра Даля. Справа ў тым, што ў XIX ст. у поглядах на характар беларускай мовы не было адзінства. Адны даследчыкі лічылі яе самастойнай славянскай мовай, другія ж разглядалі як своеасаблівы дыялект рускай або польскай. Дарэчы будзе прыгадаць, што нават такі аўтарытэтны даследчык нашай мовы, як акадэмік Яўхім Карскі, доўгі час пазбягаў тэрміна «беларуская мова». Сам жа І. Насовіч лічыў беларускую мову самастойнай славянскай мовай з уласцівымі ёй лексічнай сістэмай і граматычным ладам. На жаль, рэцэнзенты і рэдактары слоўніка былі на пазіцыях царскага самадзяржаўя, якое не прызнавала за беларусамі права на самастойнасць, усяляк перашкаджала развіццю нацыянальных традыцый.

Першае знаёмства І. Насовіча з выдадзеным у 1870 годзе слоўнікам выклікала рашучы пратэст. Сваё абурэнне ён выказаў у форме паэтычнага дыялогу. Менавіта гэты аўтограф верша-эпіграмы і знаходзіцца зараз у адным з экземпляраў слоўніка, які захоўваецца ў бібліятэцы Беларускага дзяржаўнага універсітэта. Тэкст напісаны на рускай мове чорным чарнілам згодна з патрабаваннямі тагачаснай арфаграфіі. Уклеены ў слоўнік ліст крыху пажаўцеў ад часу, але чытаецца напісанае даволі лёгка:

Явка Белорусскаго словаря
по выходе изъ печати къ своему
въ Мстиславле Автору.
***Словарь:***
Здоровъ, панъ!
***Автор:***
Ба! Изъ Петербурга.
Чтожъ это? Ты братъ сталъ курносъ!
Не ужъ-то ты въ рукахъ хирурга
Оставилъ свой Кривичскій носъ?
(Предисловие).
***Словарь:***
Мой носъ сорвалъ къ какой-то цели
И спряталъ у своей портфели
Членъ Академіи Зоил (И. И. Срезневский – М. П.)
Къ моей-же сжалясь кто-то роже
На нос кривичскій не похоже
Красивый носикъ приклеилъ.
***Автор:***
Пусть такъ! Ты въ немъ похожъ на франта

Фізіогномія-жъ не та!
Кривичскій носъ былъ носъ гиганта
Породы всехъ славянъ черта.
А тутъ не видно, съ кемъ съродни ты!
Твои какъ будто черты слиты
Съ фізіогноміей чужой
Вліянье польское ничтожно
Тебе приписано здесь ложно
Везде характер виден твой.
Ив. НОСОВИЧ.
1870 г.

У гэтым вершы-эпіграме выключна ўдала перададзены гнеў і абурэнне аўтара пазіцыяй выдаўцоў і аднаго з рэдактараў слоўніка – акадэміка І. Сразнеўскага, які беларускай мове прыпісаў «вліянье польское». Аднак падобнае «прычэсванне» не схавала самабытнасці і арыгінальнасці «кривичской» (беларускай) мовы – «везде характеръ виденъ твой»!

І. Насовіч не быў прафесіянальным філолагам, не меў ён спецыяльнай вышэйшай адукацыі, як не было ў яго вучоных ступеняў і званняў. Аднак ён па праву лічыцца першапраходцам сярод лепшых даследчыкаў духоўнай спадчыны беларускага народа. Вера ў шчаслівую долю роднага слова, нязломнасць і рашучасць у дасягненні пастаўленай мэты, незвычайная працавітасць і руплівасць – усё гэта выклікае глыбокую пашану нашчадкаў, дае нам узор беззапаветнага служэння беларускаму народу ў імя яго будучыні.

*А. У. Пятровіч (Мінск)*

## СТАЎЛЕННЕ ДА ІНАВАЦЫЙНЫХ ВАРЫЯНТАЎ І ПРАВАПІСНЫХ СІСТЭМ У СУЧАСНАЙ БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ (ПАВОДЛЕ ДАДЗЕНЫХ САЦЫЯЛІНГВІСТЫЧНАГА АПЫТАННЯ)

Цягам двух апошніх дзесяцігоддзяў у сістэме беларускай мовы назіраюцца шматлікія змены, выкліканыя рознымі чыннікамі. Моўныя працэсы асабліва актывізаваліся напачатку 90-х гадоў у сувязі са стварэннем незалежнай беларускай рэспублікі, хаця цікаўнасць да нацыянальнай мовы прыкметна ўзрасла ўжо ў сярэдзіне 80-х гадоў у сувязі з палітыкай «перабудовы» з яе «дазволам» на свабоду слова. Адраджэнскія ідэі пачатку 90-х выклікалі з'яўленне ў мове некаторых інавацый, а таксама развіццё пурыстычных тэндэнцый, што разам прывяло да пашырэння варыянтнасці ў мове. Некаторыя варыянты зафіксаваны ў слоўніках і граматыках са стылістычнай пазнакай размоўнасці, а некаторыя існуюць толькі як з'явы жывой мовы – выкарыстоўваюцца ў гутарковым маўленні, у СМІ, у мастацкай і часам навуковай літаратуры і не кадыфікаваны слоўнікамі і граматыкамі.



Для таго, каб высветліць, наколькі глыбока праніклі і замацаваліся ў мове некаторыя інавацыйныя варыянты, якое стаўленне да іх у рэспандэнтаў і меркаванні наконт іх кадыфікацыі, намі быў падрыхтаваны апытальнік. Акрамя гэтага, у апытальніку дадаткова высвятлялася стаўленне рэспандэнтаў да розных правапісных сістэм.

Апытальнік пашыраўся ў 2006 годзе ў Мінску ў студэнцкім асяродку і ў асяродку навуковай, творчай і тэхнічнай інтэлігенцыі. Усяго было апытана 119 чалавек. З іх: ва ўзросце да 23 год – 99 чалавек (83,2%), пасля 33 год – 20 чалавек (16,8%). 78,2% апытаных назвалі роднай беларускую мову; 9, 2% – рускую; 7, 6% – беларускую і рускую; 4,2% – рускую і беларускую. Такім чынам, сярод апытаных асобы, для якіх беларуская мова з'яўляецца роднай, склалі 90%.

Апытальнік складаўся з дзвюх частак – сацыялагічнай (5 пытанняў) і лінгвістычнай (44 пытанні). Пытанні ўласна лінгвістычнай часткі былі падзеленыя на тры групы (марфалогія, сінтаксіс і словаўтварэнне) і высвятлялі стаўленне рэспандэнтаў да некаторых інавацыйных з'яў у сучаснай беларускай мове[1]. Пытанні першай групы (22 пытанні) высвятлялі стаўленне рэспандэнтаў да некаторых марфалагічных варыянтаў, сярод якіх: поўныя і кароткія формы абагульнена-якасных займеннікаў (*гэта, наша vs. гэтае, нашае слова*); словаформы прыметнікаў і іншых дапасаваных часцін мовы ў родным склоне адзіночнага ліку (*новай, маладой vs. новае, маладое літаратуры*); словаформы назоўнікаў мужчынскага роду роднага склону адзіночнага ліку (*з горада Полацка vs. з гораду Полацку*). Пытанні другой групы (5 пытанняў) датычыліся сінтаксісу: прыназоўнікі *аб* і *пра (аб сястры, аб бацьку vs. пра сястру, пра бацьку)*; канструкцыі з указаннем на час дзеяння (*у савецкі час vs. за савецкім часам*). Пытанні трэцяй групы (17 пытанняў) высвятлялі стаўленне апытаных да тых ці іншых словаўтваральных мадэляў у мове: ужыванне прыставак *у-, с- (са-), з-* (*уехаць vs. з'ехаць, устарэлы vs. састарэлы*); суфіксы *-альн-* і *-н- (патэнцыяльны, правінцыяльны vs. патэнцыйны, правінцыйны)*, *-ір-ава-* і *-ава- (унармаваць, эміграваць vs. унарміраваць, эмігрыраваць)* у іншамоўных словах; суфіксы *-ов-* і *-ыўн- (-н-)* ва ўласнабеларускіх і запазычаных словах (*спартовы vs. спартыўны, нармальна vs. нармалёва*).

У першую чаргу намі разглядаліся выпадкі, калі некаторыя з прапанаваных варыянтаў кадыфікаваны і замацаваны ў акадэмічных граматыках як варыянт нормы. Іншыя існуюць у мове мастацкай, публіцыстычнай і часткова – у навуковай літаратуры ў проціпастаўленне традыцыйным, замацаваным лексікаграфічнымі і граматычнымі кодэксамі, ужываннем. Такія варыянты збольшага ўзніклі ў беларускай мове ў 1990-я гады ў сувязі з атрыманнем магчымасці дасягу

[1] *Частку ўключаных у апытальнік з'яў назваць інавацыямі можна даволі ўмоўна з той прычыны, што некаторыя з іх узніклі ў мове яшчэ на пачатку стагоддзя і зафіксаваны ў слоўніках 20-30-х гадоў, аднак з розных прычын не трапілі ў слоўнікі і граматыкі пазнейшага часу.*